лексическими единицами: рус. ***тыква***, ***фонарик из тыквы***, ***конфеты***, ***свечи***, ***костюмы***, ***открытки***, ***нечистая сила, ведьма***, ***превидение*** / пол. ***dynia***, ***latarka z dyni***, ***cukerki***, ***świece***, ***kostium***, ***pocztówka***, ***nieczyste siły***, ***wiedźma***, ***widmo***.

**Заключение.** Таким образом, лингвокультурологический анализ названий праздников и их происхождение в русском и польском языках, эволюцию изменений этих названий, можно прийти к выводу, что каждый праздник содержит в себе информацию об определенных исторических событиях и ассоциируется с культурно-значимой лексикой. Внимательное изучение геортонимов и праздничных ассоциаций помогает глубже изучить, понять культуру и лингвокультуру русского и польского народов.

**Список цитируемых источников**

1. *Пронина, И. Г.* Феномен праздника в контексте отечественной культуры [Электронный ресурс] : автореф. дис. … канд. филос. наук : 24.00.01 / И. Г. Пронина ; Морд. гос. ун-т им. Н. П. Огарева. — Саранск, 2001. — 19 с. — Режим доступа: http://www.dslib.net/teorja-kultury/fenomen-prazdnika-v-kontekste-otechestvennoj-kultury.html . — Дата доступа: 03.04.2024.

2. *Топоров, В. Н.* Праздник / В. Н. Топоров // Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. — М. : Совет. энцикл., 1992. — Т. 2 : К—Я. — С. 329—331.

3. *Шмелькова, В. В.* Праздник как компонент русской национальной лингвокультуры [Электронный ресурс] / В. В. Шмелькова, Д. П. Пономарева // Каз. наука. — 2020. — № 12. — С. 86—88. — Режим доступа: https://www.elibrary.ru/item.asp?id=44458034 . — Дата доступа: 03.04.2024.

4. *Аничков, Е.* Праздники ветхозаветные [Электронный ресурс] / Е. Аничков // Энциклопедический словарь Ф. А. Брокгауза и И. А. Ефрона : в 86 т. с ил. и доп. материалами ; изд. Ф. А. Брокгаузъ, И. А. Ефронъ ; под ред. И. Е. Андреевскаго, К. К. Арсеньева, Ѳ. Ѳ. Петрушевскаго. — СПб., 1890—1907. — Режим доступа: http://www.vehi.net/brokgauz/ . — Дата доступа: 03.04.2024.

УДК 821.161.3.09-3

**Н. Ч. Іваноўская, А. І. Белая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ПРЫЁМЫ СТВАРЭННЯ АНІМАЛІСТЫЧНАГА ВОБРАЗА Ў «БІЯГРАФІІ КОСАЧА» УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ

**Уводзіны.** У фальклоры і мастацкай літаратуры вобразы жывёл прысутнічалі заўсёды. Менавіта на аснове фальклорных твораў ажыццяўляецца тыпалогія анімалістычных вобразаў. Анімалістычным вобразам надаецца важная роля ў літаратурных творах: яны ўзмацняюць і падкрэсліваюць розныя настроі чалавека, глыбей раскрываюць свет яго перажыванняў і ўяўленняў пра з’явы рэчаіснасці. Таму надзвычай значны элемент сістэмы анімалістычных вобразаў, увасобленых у беларускай літаратуры, — свойская жывёла, а асабліва конь.

Асаблівая разнастайнасць матываў і сюжэтаў, звязаных з анімалістычнымі вобразамі, узнікла ў літаратуры ў ХХ стагоддзі, калі анімалістыка зрабілася свайго роду арэнай філасофскіх роздумаў і разваг пра свет прыроды, месца ў ім чалавека і жывёлы. Так, апавяданне К. Чорнага «Буланы», створанае ў 1920-я гады, з’яўляецца адным з тых твораў, дзе асабліва яскрава праявіліся такія вызначальныя рысы творчасці пісьменніка, як псіхалагізм і філасафічнасць.

**Асноўная частка.** Да другой паловы ХІХ ст. у мастацкай літаратуры актыўна пачала адлюстроўвацца ўвага да працоўных жывёл і іх рэальнага існавання. Мы вылучылі адзін з яскравых празаічных твораў літаратуры гэтага перыяду. Пяру У. Сыракомлі належыць апавяданне «Біяграфія Косача», якое было напісана на польскай мове і перакладзена на беларускую Кастусём Цвіркам.

*«...Любая праца, якая прыносіць людзям карысць, заўсёды вартая ўхвалы»* [1, с. 505]. Якраз гэтае перакананне і абумовіла, па словах У. Сыракомлі, задуму напісаць «біяграфію Косача».

Уладзіслаў Сыракомля — беларускі і польскі паэт-гуманіст, пісьменнік, публіцыст, ураджэнец фальварка Смольгаў Бабруйскага павета Мінскай губерніі. Жыццё яго праходзіла ў розных мясцінах тагачаснай Беларусі. Жыў на Палессі, у Нясвіжы, на Стаўбцоўшчыне, Навагрудчыне, у Вільні, на Ашмяншчыне. Творчасць Сыракомлі адметная палымяным патрыятызмам, глыбокім веданнем гісторыі Бацькаўшчыны. Пра Беларусь-Літву ён ведаў не з кніжак, а з рэальнага жыцця, што і зблізіла яго з народам і народнай культурай, зрабіла глыбокім знаўцам характару, звычаяў, асаблівасцей нацыянальнай псіхалогіі беларусаў. Выказваючы спачуванне і сімпатыю да беднага люду, прапаведуючы дабро і гуманізм, паэт параўноўваў сябе з вясковым лірнікам. У прыватнасці, ён вельмі добра разумеў, як шмат значыць конь у сялянскім жыцці. Добры конь быў прадметам гонару шляхетнага гаспадара і карміцелем простага мужыка.

У аснове мастацкай структуры апавядання «Біяграфія Косача», як сведчыць назва твора, — жыццяпіс каня. Такая жанравая адметнасць уласціва раману Ганны Сьюэл «Чорны прыгажун» і аповесці Льва Талстога «Халстамер». Аднак калі ў гэтых двух творах змешчана «аўтабіяграфія» каня, конь сам «апавядае» сваю гісторыю, то суб’ектам аповеду ў творы У. Сыракомлі выступае аўтар.

Репозиторий БарГУ

Пры стварэнні анімалістычных вобразаў у літаратуры найбольш распаўсюджаны такія прыёмы, як эстэтычны антрапамарфізм і гіпатэтычны псіхалагізм. Вылучаюць эстэтычны антрапамарфізм, калі адбываецца перанос рысаў прыроды на чалавека (ці яго адносіны) і наадварот, і штодзённа-практычны, характэрны для паўсядзённага жыцця людзей, а таксама для ўласцівых дзецям асаблівасцей вытлумачэння прычынна-выніковых адносін у прыродзе па аналогіі з адносінамі паміж людзьмі [2]. Гіпатэтычны псіхалагізм дазваляе перадаць меркаваны ход думак і разважанняў жывых істот. Гэтыя прыёмы дазваляюць па-мастацку паказаць цесную ўзаемасувязь свету жывёл і свету людзей, узбагачаюць уяўленні і веды аб прыродзе.

Формай праяўлення антрапамарфізму ў дадзеным творы выступае антрапамарфізуючы наратыў, асноўная форма якога — «антрапамарфізацыя ўнутранага свету неантрапаморфнага персанажа» [3, с. 21]. У. Сыракомля не надзяляе свайго каня здольнасцю размаўляць, аднак менавіта аўтарскі наратыў дапамагае надзяліць персанажа з жывёльнага свету такімі чалавечымі здольнасцямі і пачуццямі, як радасць, здзіўленне, страх.

Апавядаючы пра нядзельнае падарожжа на кірмаш, Уладзіслаў Сыракомля кіруецца штодзённа-практычным антрапамарфізмам, паведамляючы, як конік-бедалага, *«хацеў ён ці не хацеў, а мусіў пускацца… у дарогу, бо інакш некалькі гадзін заставаўся б без корму»* [1, с. 508], і са спушчанай галавой ішоў услед за брычкай, у якую была ўпрэжана маці. Праўда, з часам настрой яго змяняецца, і *«малады наш герой, вараны жарэбчык, гарцуе сярод гэтага тлуму, пастуквае сваімі маленькімі капыткамі»* [1, с. 508]. Пісьменнік нібы выбачаецца перад чытачамі: *«Даруйце мне за гэты просты і не новы абразок»* [1, с. 510]. На зваротным шляху быў прыпынак ля карчмы, дзе, насмактаўшыся матчынага малака, конік лёг адпачыць у цяньку. Але, *«зглядзеўшы, што брыка рушыла далей у дарогу, ён неахвотна ўздымаецца і бяжыць следам»* [1, с. 508].

Многія моманты з жыцця каня, як і належыць, маюць натуралістычны характар, але больш важна тое, якую ролю ў гэтым апісанні адыгрываюць элементы персаніфікацыі. Ствараючы анімалістычны вобраз ключавога персанажа, аўтар свядома выкарыстоўвае прыём антрапамарфізму, які дазваляе перанесці чалавечыя характарыстыкі і ўласцівасці на каня. У. Сыракомля паказвае, што конь — жывая істота, якой таксама ўласцівы пачуцці. Ён *«часта імчаўся наўгалоп, кружыў вакол маткі, раздзімаў храпы, уцягваючы паветра. У грудзях яго было весела, сэрца гуляла, як рыба ў вадзе на пагоду»* [1, с. 507].

Мэтазгоднае выкарыстанне аўтарам прыёму эстэтычнага антрапамарфізму ўзмацняе псіхалагізм аповесці. Аднак, паколькі жывёлы самі па сабе не надзелены здольнасцю да псіхалагізму, у адносінах да іх мы можам выкарыстаць тэрмін «гіпатэтычны псіхалагізм». Гэта ж адносіцца і да вобраза Косача: *«Калі б ён меў розум, мог бы вольна гуляць па мяжы, шчыпаць сабе спакойна канюшыну. Але ён баяўся згубіць матку і таму бег увесь час за бараной, грузнучы сваімі слабымі яшчэ ножкамі ў пульхнай раллі»* [1, с. 508].

Калі Косач першы раз убачыў дзённае святло, то, канечне ж, невядома, што ён падумаў, *«але, відаць, падумаў нешта добрае, бо аж тры разы радасна падскочыў»*. Жарэбчык рос, мацнеў, і *«бегаў па зямлі з незвычайнай радасцю»* [1, с. 507].

Як адначалася раней, увага да працоўных жывёл і іх рэальнага існавання становіцца адной з вядучых ідэй мастацкай анімалістыкі. Не з'яўляецца выключэннем і У. Сыракомля. Шляхецкая каняга, заўважае пісьменнік,— *«гэта не панскі рысак, не пястун, які мае толькі адзін нейкі абавязак. У нас адзін і той жа конь служыць і для верхавой язды, і для таго, каб цягаць воз ці барану. Усё ён павінен умець, ні ад якога цяжару яму нельга ўхіляцца»* [1, с. 509]. Гэта паказана праз лёс маці Косача, на якую аднойчы надзелі цяжкі хамут, прычапілі да пастронкаў цяжкую барану, на барану палажылі цяжкі камень і павялі ў поле баранаваць гарох. Баючыся згубіць матку, жарэбчык увесь час бег услед за бараной, грузнучы слабымі ножкамі ў мяккай раллі. А *«нелітасцівы парабак рэдка спыняў кабылу, каб яна магла пакарміць сваё жарабя. Кароценькі прыпынак — сцёбнуў дубцом, і зноў — работа»* [1, с. 508]. Не дзіва, што гэтае бясконцае кружэнне так аслабіла малога Косача, што ўвечары яму ўжо было не да гуляў: ён расцягнуўся на зямлі і адразу ж заснуў. Так было і на другі дзень, а на трэці *«…быў адпачынак, і жарэбчык ізноў забаўляўся і скакаў, але цяпер ужо іншымі вачамі пачаў глядзець на свет і прыроду. Інстынктам адчуў рэальнае жыццё»* [1, с. 507]. Інстынкт — гэта прыроджаныя патрэбнасці і прыроджаная праграма іх задавальнення. Менавіта наяўнасць інстынкту і з'яўляецца адным з тых фактараў, якія адрозніваюць жывёлу ад чалавека. Можна сказаць, што ў асобных фрагментах твора паняцце «інстынкт» у плане спасціжэння навакольнай рэчаіснасці выступае кантэкстуальным сінонімам да паняцця «гіпатэтычны псіхалагізм».

**Заключэнне.** Важная роля ў творах фальклору і мастацкай літаратуры належыць анімалістычным вобразам. Яны акцэнтуюць розныя настроі чалавека, раскрываюць свет яго перажыванняў і ўяўленняў, а ў XX ст. паглыбляюць псіхалагізм і філасафічнасць твораў. Найбольш значны персанаж у сістэме анімалістычных вобразаў беларускай літаратуры — конь. Ужо ў XIX ст. літаратура пачала актыўна выяўляць увагу да працоўных жывёл і іх рэальнага існавання. Прыкладам гэтага можа служыць апавяданне Уладзіслава Сыракомлі «Біяграфія Косача», аснову якога складае жыццяпіс маладога коніка. Вядучымі прыёмамі абмалёўкі персанажа служаць эстэтычны антрапамарфізм (на аснове антрапамарфізуючага наратыву) і гіпатэтычны псіхалагізм.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / У. Сыракомля ; уклад., прадм., камент. К. Цвіркі. — Мінск : Кнігазбор, 2006. — 528 с.

2. *Иванов, Л.* Антропоморфизм [Электронный ресурс] / Л. Иванов. — Режим доступа: http://www.krugosvet.ru/enc/gumanitarnye_-nauki/lingvistika/ANTROPOMORFIZM.html . — Дата доступа: 05.02.2024.


Репозиторий БарГУ

3. *Альшэўская, Г. С.* Антрапамарфізм як аснова вобразнасці ў творчасці Янкі Купалы / Г. С. Альшэўская // Нам засталася спадчына : XIII Міжнар. Купал. чытанні, прысвечаныя 75-годдзю Дзярж. літаратур. музея Я. Купалы, Мінск, 24 кастр. 2019 г. / Дзярж. літаратур. музей Я. Купалы. — Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2019. — С. 20—25.

УДК 811.161.3

**В. В. Кайданава**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва», Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

# ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАДАЎ І ПРЫЁМАЎ РАЗВІЦЦЯ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З МЭТАЙ ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ

**Уводзіны.** Рэфармаванне сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь суправаджаецца істотнымі зменамі. У наш час, калі сучасная школа знаходзіцца ў рэжыме эксперыменту, творчых пошукаў, стан беларускай адукацыйнай школы XXI ст. найперш залежыць ад настаўніка [1]. Неабходна ствараць на вучэбных занятках умовы для праяўлення і задавальнення пазнавальных і камунікатыўных патрэб навучэнцаў. Менавіта яны з'яўляюцца штуршком для ўзнікнення матываў дзейнасці. С. І. Цыбульская сцвярджае, што ўсебаковае развіццё, духоўнае багацце не можа быць дасягнута па прымусу. Яно адбываецца тады, калі чалавек сам цягнецца да ведаў, навукі, мастацтва. Каб мець поспех у сучасным свеце, вучням патрэбна крытычна адносіцца да ўсіх сродкаў інфармацыі і самім прымаць рашэнні аб тым, што для іх з'яўляецца найбольш важным [2]. Відавочна, што школьнікам неабходна ўмець вырашаць складаныя праблемы, крытычна аналізуючы абставіны, прымаць прадуманыя рашэнні на аснове атрыманай інфармацыі. Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення скіравана на тое, каб абудзіць у вучняў пазнавальнаю актыўнасць, задзейнічаць тыя веды, што ўжо ёсць, і стварыць умовы для выхавання асобы, здольнай да камунікацыі і ўзаемадзеяння ў сучасным свеце.

**Асноўная частка.** На ўроках беларускай мовы мэтазгодна выкарыстоўваць метады і прыёмы тэхналогіі крытычнага мыслення. Найбольш эфектыўным метадам гэтай тэхналогіі лічыцца шасцівугольнае (гексаганальнае) навучанне. Шасцівугольнікі (гексы) — гэта пэўным чынам фармалізаваныя веды па пэўным аспекце. Гексы далучаюцца адзін да аднаго дзякуючы паняційным сувязям, што дазваляе фарміраваць у вучняў уменні ствараць самастойныя кароткія выказванні розных тыпаў і вылучаць сувязі паміж апісанымі фактамі, развіваць навыкі работы ў групах [3, с. 23].

Яшчэ адным дзейнасным метадам для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў з'яўляецца выкарыстанне на ўроках беларускай мовы інтэлект-карт. Іх мэтазгодна выкарыстоўваць на ўроках, якія змяшчаюць вялікі аб'ём інфармацыі. Асноўныя ўласцівасці выкарыстання інтэлект-карт: яны заснаваны на асацыяцыях, задзейнічаюць іерархічнае мысленне, маюць прыцягальнае візуалізаванае аблічча: колер, малюнкі, значкі. Карты памяці на ўроках беларускай мовы — гэта спосаб засвойваць новую інфармацыю інтэграваным, арганізаваным спосабам, таму ўспрыманне новых ведаў адбываецца лягчэй і ў большым аб'ёме [3, с. 41].

Выдатную маўленчую сітуацыю стварае метад «Відэасюжэт». Пры выкананні практыкаванняў вучням прапануецца прагледзець відэарад карцін вядомых беларускіх мастакоў і адказаць на прапанаваныя пытанні. Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу таксама спрыяе развіццю міжпрадметных сувязей. Перад дэманстрацыяй відэараду важна дакладна паставіць перад вучнямі пытанні, на якія патрэбна адказаць пасля прагляду карцін і адзначыць неабходнасць лаканічнасці выказвання. Гэты метад вучыць школьнікаў выражаць свае ўласныя думкі і, што не менш важна, слухаць і разумець суразмоўцаў [4, с. 47].

На ўроках беларускай мовы рэкамендуецца праводзіць лексічныя і фразеалагічныя хвілінкі, якія займаюць мала часу, могуць выкарыстацца на розных этапах, не супярэчаць асноўнай адукацыйнай тэме і ў той жа час узбагачаюць слоўнікавы запас вучняў нацыянальна-маркіраванымі моўнымі адзінкамі. У якасці лексічных хвілінак магчыма прапаноўваць вучням заданні на знаходжанне «чацвёртага лішняга», падбор аднаслоўных адпаведнікаў, суаднясенне слова з яго лексічным значэннем, размеркаванне слоў у тэматычныя групы [4, с. 49].

У 5—6 класах работа з вучнямі накіравана над вырашэнне наступных задач: засваенне сістэмы мовы, развіццё ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці, авалоданне маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабамі перадачы думкі ў вуснай і пісьмовай формах, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў, развіццё сродкамі мовы камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў. Выкарыстанне метадаў і прыёмаў тэхналогіі крытычнага мыслення павінна выклікаць у вучняў жаданне ствараць сітуацыю выказвацца пабеларуску, ствараць сітуацыю поспеху, вучыць дакладнасці і лаканічнасці ў маўленні, правілам суразмоўцы.

У 7—8 класах на ўроках беларускай мовы настаўнік працуе над фарміраваннем наступных кампетэнцый вучняў: уменне граматычна правільна ствараць і афармляць свае вусныя і пісьмовыя паведамленні, выбіраць з багатага арсеналу выяўленчых моўных сродкаў самыя трапныя, дасканалыя і пераканаўчыя, мець уласную пазіцыю, фарміраваць уменне весці дыялог і працаваць у камандзе.

На этапе актуалізацыі ведаў можна выкарыстаць прыём «Знайдзі невядомае». Вучням прапануецца спіс слоў, якія абазначаюць паняцці тэмы (тэм), якія яны ўжо прайшлі. Сярод іх ёсць паняцці, з якімі яны яшчэ не